*Ганна Бабчанок*

**ВОПЫТ ВЫКАРЫСТАННЯ РЭГІЯНАЛЬНАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў ПАЗАШКОЛЬНАЙ РАБОЦЕ Ў АСІПОВІЦКІМ РАЁНЕ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ**

*Anna Babchanok*

**THE EXPERIENCE OF REGIONAL FOLKLORE USAGE IN EXTRACURRICULAR ACTIVITIES IN THE OSIPOVICHI DISTRICT, MOGILEV REGION**

*У гэтым артыкуле раскрываецца спецыфіка і змест выкарыстання рэгіянальнага фальклору Беларускага Падняпроўя ва ўстановах культуры і дадатковай адукацыі Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці.*

*This article deals with the specifics of the use and maintenance of local folklore of Belarusian Dnieper region in culture and additional education establishments in Osipovichi district, Mogilev region.*

Свядомая нацыя не мае права зняважаць ці, тым больш, забываць пра сваё мінулае. Павага да старэйшага пакалення і добрае веданне мінулага краю, прага да вывучэння яго гісторыі – гэта ледзь не асноўныя рысы, па якіх можна дакладна меркаваць пра культурны, маральны і этнаэкалагічны ўзровень побыту народа. У пошуках шляхоў фарміравання маральных каштоўнасцей падлеткаў беларускае грамадства XXI стагоддзя ўсё часцей звяртаецца да фальклору як да найважнейшай формы адлюстравання нацыянальнага характару, гістарычных і культурных каштоўнасцей народа.

Фалькларыстычная дзейнасць мае сваю спецыфіку. Кожная мясцовасць мае сваю гісторыю, самабытную і непаўторную культурную і прыродную спадчыну. Фальклор дае магчымасць звярнуць увагу на карані – на асабісты радавод, этнаграфічна-культурныя асаблівасці рэгіёна, вобласці, рэспублікі. Арганічнае злучэнне гісторыі, культуры, фальклору і традыцый сям’і, малой радзімы, краіны фарміруе духоўнае адзінства, якое павінна прыняць, усвядоміць і засвоіць моладзь. Дапамагчы ім у гэтым галоўная задача не толькі ўстаноў адукацыі, але і іншых пазашкольных устаноў: цэнтраў творчасці, устаноў культуры, бібліятэк і г.д. З гэтай мэтай у рэспубліцы ладзяцца розныя творчыя конкурсы, акцыі, якія дапамагаюць падлеткам па-новаму ўбачыць традыцыі і абрады беларусаў, аб’екты гісторыі, культуры сваёй мясцовасці, далучыцца да творчага пошуку, праявіць сябе ў розных сферах дзейнасці.

Пры правядзенні любога выхаваўчага мерапрыемства з выкарыстаннем фальклору неабходна: а) нарматыўнае афармленне яго дзейнасці (загад, праграма, палажэнне і інш); б) арганізацыйна-кіраўнічае забеспячэнне (правядзенне сходаў, давядзенне сутнасці мерапрыемства, яго задач, кантроль за ходам працы); в) фінансава-гаспадарчае забеспячэнне (набыццё неабходных матэрыялаў, абсталявання); г) праграмна-метадычнае забеспячэнне (музычнае суправаджэнне, сцэнарый і г.д.).

Пры арганізацыі фальклорных мерапрыемстваў неабходна прытрымлівацца наступных асноўных прынцыпаў:

1. Выкарыстанне сістэмнага падыходу, які дазваляе сканструяваць найбольш аптымальную структуру мерапрыемства, дзейнасць усіх зацікаўленных асоб.
2. Псіхолага-педагагічнае суправаджэнне мерапрыемтваў. Вызначэнне погляду аўдыторыі, выяўлення прычын яго змянення.
3. Выкарыстанне новых тэхналагічных сродкаў. Сучасныя мультымедыйныя тэхналогіі дапамагаюць атрымаць новыя цікавыя эфекты псіхолага-педагагічнага ўздзеяння.
4. Музычнае афармленне мерапрыемства з’яўляецца важным паказчыкам яго якасці. Яно павінна адпавядаць мэтам і зместу.
5. Мастацкае аздабленне залы адыгрывае важную ролю ў падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемства з выкарыстаннем фальклору.
6. Суправаджэнне мерапремства адпаведнай рэкламай.
7. Улік узросту вучняў пры арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў. Гэта дапаможа адысці ад простай апекі над дзецьмі і стварыць неабходныя ўмовы для развіцця асобы.
8. Захаванне прынцыпаў арганізацыі мерапрыемстваў для вучняў сярэдняга школьнага ўзросту: інфармацыйная насычанасць, эмацыянальнасць, масавасць, дыялагічнасць, пераемнасць і паслядоўнасць далучэння дзяцей да каштоўнасцяў культуры, фальклору, фарміраванне ў іх вопыту сацыяльнага ўзаемадзеяння, добраахвотнасць удзелу.

Вырашальная роля ў арганізацыі фальклорнай працы сярод падлеткаў належыць настаўніку, кіраўніку, арганізатару, які выступае ў выглядзе прапагандыста ведаў пра традыцыі і абрады, вуснае народнае мастацтва рэгіёна. Таму работнік, які займаецца вывучэннем рэгіянальнага фальклору разам з падлеткамі, павінен кіравацца наступнымі рэкамендацыямі: а) ведаць змест нацыянальна-рэгіянальнага кампанента на тэарэтычным узроўні; б) вызначаць месца, значэнне, патрэбнасць вывучэння рэгіянальнага фальклору ў кантэксце рэспубліканскага; в) валодаць методыкай сістэматызацыі фальклорных ведаў; г) вызначаць навучальныя, выхаваўчыя і развіццёвыя задачы пры фарміраванні ведаў; д) умець суадносіць агульнае і асобнае ў развіцці, усведамляць унікальнасць рэгіянальнага фальклору.

Вырашальнае значэнне ў арганізацыі фальклорнай пазашкольнай дзейнасці належыць папярэдняй самападрыхтоўцы работнікаў дадзеных устаноў. Яны павінны мець уяўленні аб асноўных цэнтрах збіральніцкай і навукова-даследчай работы па фальклоры. Кіраўнік фальклорнага аб’яднання павінен: а) быць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаёмым з літаратурай па методыцы і абмену вопытам фальклорнай дзейнасці; б) умець працаваць з рознымі відамі крыніц, у тым ліку архіўнымі; в) праводзіць заняткі цікава, зразумела і з выкарыстаннем featрознабаковых форм і тыпаў: самастойная праца з крыніцамі; экскурсіі; экспедыцыі па родным краі; даследаванні і праектная дзейнасць; праца прадметнага клуба, гуртка, ансамбля, творчага калектыву; навукова-даследчыя канферэнцыі, стварэнне прэзентацый, выступленні з дакладамі; сустрэчы і гутаркі з цікавымі людзьмі; публікацыі ў СМІ і г.д. г) актыўна выкарыстоўваць інтэрактыўныя метады; л) выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйныя метады, асабліва ў праектна-даследчай дзейнасці.

Адным з найбольш актыўных цэнтраў выкарыстання рэгіянальнага фальклору ў Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці сярод вучняў сярэдняга школьнага ўзросту з’яўляюцца ўстановы культуры, дзейнасць якіх накіравана на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнне ўмоў для развіцця творчых здольнасцей дзяцей і моладзі, арганізацыю змястоўнага адпачынку насельніцтва. Сетка ўстаноў культуры раёна прадстаўлена дзяржаўнай установай культуры «Цэнтралізаванная клубная сістэма Асіповіцкага раёна», якая аб’яднала 27 клубных устаноў, дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка Асіповіцкага раёна», у складзе якой 32 бібліятэкі, дзяржаўная ўстанова культуры «Асіповіцкі раённы гісторыка-краязнаўчы музей», кінатэатр «Радзіма», 10 дзіцячых школ мастацтваў з 12 філіяламі, Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі «Асіповіцкі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі». Ва ўсіх аграгарадках раёна працуюць клубныя ўстановы і бібліятэкі [1, с. 686].

Працаўнікі надаюць вялікую ўвагу адраджэнню абрадаў, традыцый, народнай творчасці з прыцягненнем да ўдзелу вучняў сярэдняга школьнага ўзросту. Традыцыйна ў раёне праходзяць святы народных традыцый «Шчадроўкі» з удзелам народных калектываў «Вязанка», «Чыстыя крыніцы», «Ліпеньскія зоркі», «Дзівакі», «Вечарынка», «Сузор’е» і іншых [2, с. 2; 3, с. 2].

Падсумоўваючы ўсё сказанае вышэй, неабходна адзначыць, што ў Асіповіцкім раёне даволі актыўна вядзецца праца па выхаванні дзяцей і падлеткаў сродкамі выкарыстання рэгіянальнага фальклору сельскімі дамамі культуры, цэнтрамі творчасці, бібліятэкамі, што з’яўляецца важнай крыніцай патрыятычнага выхавання падлеткаў, пашырэння іх жыццёвага кругагляду. Праз вывучэнне і выкарыстанне рэгіянальных асаблівасцей адбываецца асэнсаванне агульных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Неабходна адзначыць, што працэс выкарыстання рэгіянальнага фальклору ў пазашкольнай дзейнасці сярод вучняў сярэдняга школьнага ўзросту патрабуе навукова-метадычнага суправаджэння. Метадычныя рэкамендацыі будуць забяспечваць пазашкольную дзейнасць кіраўнікоў, настаўнікаў, арганізатараў ў галіне развіцця асабістых кампетэнцый вучняў сярэдняга школьнага ўзросту, неабходных для фарміравання грамадзяніна і патрыёта, адказнага сем’яніна, канкурэнтназдольнай асобы, здольнай прымаць асэнсаваныя рашэнні, эфектыўнай працоўнай і прафесійнай дзейнасці, якія б садзейнічалі развіццю і росквіту Рэспублікі Беларусь.

**Спіс літаратуры:**


1. Памяць. Асіповіцкі раён. – Мінск, 2002. – С. 684–686.
2. Валадзько, Т. Цэнтр, куды спяшаюцца падлеткі / Т. Валадзько // Асіповіцкі край. – 2004. – №83. – 19 кастр. – С. 2.
3. Выбодовская, Г. Центр творчества и побед / Г. Выбодовская // Асіповіцкі край. – 2006. – 28 сак. – С. 2.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ